# Пасвячэнне: Метад Гуань Йінь

Настаўнік Ching Hai пасвячае шчырых людзей, якія жадаюць зведаць Ісціну, у метад Гуань Йінь. Кітайскія іерогліфы Гуань Йінь абазначаюць успрыняцце гукавой вібрацыі. Метад заключае ў сабе медытацыю, або разважанне пра Унутранае Святло і Унутраны Гук. Гэтыя ўнутраныя працэсы былі неаднаразова апісаны ў духоўнай літаратуры ўсіх сусветных рэлігій, пачынаючы з самых старажытных часоў.

Напрыклад, хрысціянская Біблія кажа: "**На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Богам было Слова**". (Паводле Іоана Сьв. Эвангельле, 1:1) Гэтае Слова ёсць Унутраны Гук. Яно называлася яшчэ Логас, Шабд, Дао, Гукавая плынь, Наам або Нябесная Музыка. Настаўнік Ching Hai кажа: "**Яно вібруе ўнутры ўсяго жывога і падтрымлівае ўвесь Сусвет. Гэтая ўнутраная мелодыя можа вылечыць усе раны, выканаць усе жаданні і спатоліць смагу ўсяго свету. Яна ўсемагутна і ўся – Любоў. Менавіта таму, што мы складаемся з гэтага Гука, кантакт з ім прыносіць мір;**

**спакой у нашыя сэрцы. Пасля праслухоўвання гэтага Гука усё нашае быццё мяняецца, усе нашыя погляды на жыццё значна змяняюццца да лепшага**".

Унутранае святло, Святло Бога – гэта тое святло, якое маецца на ўвазе ў слове "прасвятленне". Яго інтэнсіўнасць можа вар іравацца ад слабога свячэння да зыркасці мільёнаў сонцаў. Менавіта праз Унутранае Святло і Гук мы зведваем Бога.

Пасвячэнне ў Метад Гуань Йінь – не таямнічы рытуал або цэрымонія ўступлення ў норвую рэлігію. Падчас пасвячэння даецца спецыяльная інструкцыя па медытацыі над Унутраным Святлом і Унутраным Гукам, а Настаўнік Ching Hai здзяйсняе "духоўную перадачу". Першае адчуванне Боскай прысутнасці даецца ў цішыні. Настаўніку Ching Hai не трэба прысутнічаць фізічна, каб адкрыць гэтыя дзверы для вас. Гэтая перадача – асноўная частка метаду. Сама тэхніка не прынясе вялікай карысці без Блаславення Настаўніка.

Паколькі вы можаце пачуць Унутраны Гук і ўбачыць Унутранае Святло непасрэдна пад час медытацыі, гэтая з ява часам называецца "раптоўнае" або "непасрэднае прасвятленне".

Настаўнік Ching Hai прымае людзей усіх слаёў і рэлігійных поглядаў для пасвячэння. Вам не трэба мяняць вашу рэлігію або веру. Вас не будуць упрошваць уступіць у нейкую арганіза цыю або ўзяць удзел у чым-не-

будзь, што не адпавядае вашаму цяперашняму стылю жыцця.

Аднак вам прыйдзецца стаць вегетарыянцам. Абавязковая вегетарыянская дыета на працягу ўсяго жыцця – неабходная перадумова да атрымання пасвячэння.

Пасвячэння праводзіцца бясплатна.

Штодзённая практыка Метада медытацыі Гуань Йінь і выкананне "Пяці запаведзяў" – адзіныя патрабаванні да вас пасля пасвячэння. Запаведзі – гэта кіраўніцтва, якое дапаможа вам не прыносіць шкоды ні сабе, ні якой іншай жывой істоце. Гэтыя трэніроўкі паглыбяць і ўзмоцняць вашае пачатковае прасвятленне і дазволяць вам з цягам часу дасягнуць найвышэйшых узроўняў Абуджэння. Без штодзённай практыкі вы амаль напэўна забудзецеся на сваё прасвятленне і вернецеся да звычайнага ўзроўню свядомасці.

Мэта Настаўніка Ching Hai – навучыць нас быць самастойнымі. Таму Яна вучыць нас метаду, які можа выкарыстоўваць штодня, самастойна, без ніякіх дапаможнікаў. Яна не шукае паслядоўнікаў, прыхільнікаў або вучняў і не збіраецца ствараць арганізацыю з платным членствам. Яна не прыме грошы ці якія-небудзь падарункі ад вас, таму вам не варта прапаноўваць ёй гэта.

Яна прыме вашу шчырасць у штодзённым жыцці і практыку медытацыі, каб вы пасоўваліся наперад да святасці.

# Пяць Запаведзяў

1. **Не адбіраць жіццё ў жывых істот.***

2. **Не апаганьваць весны свае няпраўдай.**

3. **Устрымліваццa ад таго, каб узяць тое, што табе не прапанавана.**

4. **Устрымліваццa ад неўпарадкаваных сэксуальных паводзіна.**

5. **Устрымліваццa ад спажывання ап яняльных рэчываў.**

* Выкананне гэтай запаведзі патрабуе прытрымкі малочна-вегатырыянскай дыеты.